*Дзіна ДУБІНІНА,*
*аспірантка кафедры методык дашкольнага выхавання*
*Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М.Танка*

# АЗНАЯМЛЕННЕ З ПАЭЗІЯЙ

***Знаёмства дашкольнікаў з паэтычнымі творамі з'яўляецца неад'емным кампанентам выхаваўчай работы дзіцячага сада. Паэтычнае мастацтва развівае ў дзяцей эстэтычнае ўспрыманне тэксту, пачуццё гармоніі, прыгажосці, фантазіі, ініцыятывы, выхоўвае мастацкі густ, здольнасць эмацыянальна адгукацца на вобразнае маўленне. Паэзія закладвае асновы духоўнасці, дае магчымасць дзіцяці ўспрымаць навакольны свет ва ўсім яго непарыўным адзінстве.***

Для дашкольнікаў паэзія—гэта перш за ўсё адкрыццё. Адкрыццё вобразнага гучання слова, паэтычнай рыфмы, захапляючай чароўнай мелодыі, мастацкага вобраза.

Далучэнне да сапраўдных вытокаў высокай паэзіі з'яўляецца асноўнай мэтай работы выхавальнікаў. Рэалізацыя гэтай мэты ў многім залежыць ад самога педагога, ад яго ўмення цікава, ярка, даступна данесці мастацкі вобраз да дзіцяці, вызваць эмацыянальны водгук на гэты вобраз, раскрыць эстэтычныя якасці паэтычнага твора. Дашкольнікі павінны не толькі пачуць верш, які толькі што прагучаў, але і адчуць яго ў сваім сэрцы. Працэс далучэння дзіцяці да паэтычнага мастацтва К.І.Чукоўскі назваў "вершаваным выхаваннем".

Знаёмства дзяцей з паэтычнымі творамі можа адбывацца не толькі ў працэсе спецыяльных заняткаў па мастацка-маўленчай дзейнасці, але і ў індывідуальным парадку пры правядзенні кароткіх хвілінак паэзіі, на занятках па іншых відах дзейнасці, у час падрыхтоўкі да каляндарных і народных святаў.

Большая частка вершаў, з якімі знаёмяцца дашкольнікі ў дзіцячым садзе, завучваецца на памяць. Таму ад педагагічнага майстэрства выхавальнікаў залежыць іх мастацкае чытанне дзецьмі.

Некаторыя паэтычныя творы педагог можа выкарыстоўваць не толькі для завучвання з дашкольнікамі на памяць, але і для азнаямлення маленькіх слухачоў з мелодыяй гучання мастацкага слова, яго вобразнасцю і выразнасцю. Дзеці могуць разыгрываць паэтычны змест вершаваных твораў, інсцэніраваць іх.

Разам з тым выхавальнік павінен улічваць, што ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму завучванне вершаў на памяць з'яўляецца адным з найбольш выпрабаваных прыёмаў развіцця маўлення на другой блізкароднаснай мове. У дзяцей не толькі ўзбагачаецца лексічны запас слоў, але і фарміруюцца навыкі правільнага выкарыстання той ці іншай формы ў пэўнай маўленчай сітуацыі. Завучванне вершаў на памяць дапамагае дашкольнікам адпрацаваць навыкі правільнага выразнага вымаўлення гукаў, гукапераймання, слоў, словазлучэнняў.

Дзяцей неабходна вучыць сапраўднаму глыбокаму ўспрыманню паэтычнага мастацтва. "Некаторыя нават не задумваюцца над тым,—пісаў К.І.Чукоўскі,—што калі дзеці вучацца спевам, слуханню музыкі, рытмічнай гімнастыцы і г.д., то тым больш іх неабходна вучыць успрыманню вершаў, таму што дзецям, калі яны стануць больш дарослымі, неабходна будзе прыняць вялікую паэтычную спадчыну ад Пушкіна, Лермантава, Някрасава, Фета, Цютчава, Маякоўскага, Байрана, Гётэ, Гюго. Але што яны зробяць з гэтай спадчынай, калі іх не навучаць да гэтага часу ёю карыстацца?"

Дашкольны ўзрост лічыцца найбольш спрыяльным перыядам мастацкага ўспрымання паэзіі. У гады дзяцінства назіраецца асаблівае імкненне дзіцяці да рытмічна арганізаванага складу маўлення. Дашкольнікі вельмі любяць слухаць і чытаць вершы. Яны аддаюць ім відавочную перавагу ў параўнанні з празаічнымі творамі. Маленькіх дзяцей цягне да дынамічных рытмаў, радаснай мелодыкі, рыфмы. Яны патрабуюць паўтараць кароткія, добра рытмізаваныя вершы з дакладнай, зразумелай і яркай рыфмай. У раннім дзяцінстве пры ўспрыманні мастацкага вершаванага твора яго непасрэдны змест не мае для дзяцей ніякай значнасці і застаецца на другім плане. У першую чаргу дзеці ўспрымаюць рытм і мелодыю, рыфму верша—увогуле ўсё тое, што вызначае мастацкі гукапіс. Успрымаючы чароўныя гукі і гукаперайманні, паэтычную рыфму, дзіця глыбей пранікае ў чароўныя таямніцы высокай паэзіі. Яго ўяўленні перапаўняюцца пры гэтым яскравымі, зрокавымі вобразамі-малюнкамі. Мастацкае гучанне тэксту вершаванага твора захапляе дашкольніка, нараджае ў яго пэўныя пачуцці і вызывае адпаведны настрой. "Непасрэднасць і эмацыянальнасць дапамагае маленькаму чытачу (дакладней, слухачу) правільна ўспрыняць агульную танальнасць верша, яго настрой нават тады, калі ён не разумее значэння многіх слоў ці адлюстроўваемых пэўных сітуацый. Там, дзе даросламу неабходна зразумець, каб атрымаць асалоду, маленькі слухач атрымлівае задавальненне непасрэдна ад гучання верша",—піша Ул.Глоцэр у сваёй кнізе "Дзеці пішуць вершы".

Вершы, з якімі выхавальнік знаёміць дашкольнікаў, павінны быць высокамастацкімі, даступнымі разуменню дзяцей, здольнымі выклікаць у іх пэўныя эмоцыі.

К.І.Чукоўскі падкрэсліваў, што дзіцячы верш павінен быць цікавым і для дарослага, больш таго, павінен дастаўляць яму пэўную эстэтычную асалоду. "Паэзія для маленькіх павінна быць і для дарослых паэзіяй",—заначаў вядомы дзіцячы пісьменнік.

Методыка работы па азнаямленні дашкольнікаў з паэзіяй мае свае асаблівасці. Для малодшых дашкольнікаў неабходна падбіраць вершы невялікія па аб'ёме (4—6 радкоў), блізкія і даступныя па змесце, рытмічныя. Яны павінны абавязкова мець дынамічны рух, музычную рыфму, перадаваць пэўнае дзеянне.

У большай ступені гэтым патрабаванням адпавядаюць вершаваныя творы вуснай народнай творчасці, такія, як забаўлянкі ("Ладачкі-ладачкі", "Сарока-варона", "Ідзе каза рагатая", "Ой, бычок мой, бысенька"), песенькі ("Заінька", "Воўчанька", "Спі, сыночак міленькі"), заклічкі ("Сонейка", "Дождж", "Божая кароўка" і інш.).

Цэлая гама пачуццяў—захаплення, пяшчоты, задавальнення—перапаўняе гэтыя творы. Эмоцыі радасці, даверу, пераканананасці ў станоўчым закладзены ў самой іх пабудове. Гэтыя творы ўяўляюць сабой расфарбаваныя яскравыя слоўныя карцінкі, якія складаюць свет штодзённых уяўленняў дзіцяці.

Такія ж прыгожыя малюнкі са слоў, гучную рыфму і дакладны рытм прапануюць малодшым дашкольнікам і лепшыя дзіцячыя паэты. Яны запрашаюць дзіця парадавацца разам з імі, паназіраць за з'явамі навакольнага жыцця, убачыць незвычайнае ў звычайным.

Знаёмства дашкольнікаў з паэтычнымі творамі ў першай малодшай групе дзіцячага сада адбываецца ў працэсе штодзённых зносін. Так, у час назірання за з'явамі прыроды выхавальнік можа падкрэсліць іх прыгажосць, удакладніць некаторыя прыметы, расказаць пра іх цудоўныя ўласцівасці пры дапамозе чароўнага мастацкага слова. Гэтаму дапамогуць такія вершы, як "Сняжынкі" А.Дзеружынскага, "Верабейчык" А.Лойкі, "Пчолка" С.Сокалава-Воюша і інш.

Значна цікавейшымі стануць для дзяцей тыя рэжымныя моманты, дзе будуць гучаць паэтычныя творы: "Я сама" І.Муравейкі, "Коцік прачынаецца" А.Мясткіўская, "Ладкі-ладком" (з народнага).

Знаёмства дзяцей з цацкамі таксама можа суправаджацца чытаннем цікавых вершаў. Да іх можна аднесці вершы "Птушачка" У.Луцэвіч, "Ліска", "Мядзведзь" А.Якімовіча, "Пеўнік" П.Місцюка і інш. Гэтыя ж творы можна выкарыстоўваць для чытання ў час самастойных гульняў дзяцей з адпаведнымі цацкамі.

Чытанне выхавальнікам вершаў можа суправаджацца пэўнымі рухамі дзяцей. Народная педагогіка ў забаўлянках увогуле цесна злучыла ў адзінае цэлае мастацкае слова і пэўныя дзеянні, што яму адпавядаюць: "Сарока-варона", "Ладачкі", "Кую-кую ножку". Расказванне гэтых малых шэдэўраў вуснай народнай творчасці немагчыма без выканання пэўных рухаў: згінання і разгінання пальчыкаў, пляскання ў далонькі, пастуквання пальчыкам па назе.

Дынамічнымі рухамі могуць суправаджаць дзеці і чытанне такіх вершаў, як "У зайчыка лапкі" А.Мясткіўская *(тупанне нагамі),* "Аладкі" В.Іпатавай *("выпяканне аладак" у далоньках).*

У час чытання некаторых забаўлянак, вершыкаў, песенек выхавальнік можа мяняць імя героя на імёны дзяцей у сваёй групе. Дарэчы, дзеці вельмі любяць адчуваць сябе на месцы героя вершаванага мастацкага твора. З гэтай мэтай выхавальнік можа выкарыстоўваць наступныя вершы: "Я сама" І.Муравейкі, "Сані" А.Дзеружынскага.

У канцы года ў першай малодшай групе можна правесці гульню "Чароўны куфэрак". Пры гэтым у чароўны куфэрак пакласці тыя цацкі, пра якія дзеці на працягу года чулі розныя вершы. Чароўны куфэрак можа прынесці які-небудзь герой. Ён жа дастае цацку з чароўнага куфэрка і пытаецца ў дзяцей: "Што гэта?" Пасля таго як маленькія адкажуць, ён прапануе ім расказаць верш пра гэтую цацку.

У другой малодшай групе ў першым квартале спецыяльныя заняткі па завучванні вершаў на памяць таксама не праводзяцца. Выхавальнік чытае вершы ў працэсе штодзённых зносін, каб выклікаць пэўную цікавасць у дзяцей да паэтычнага мастацтва. Яго галоўнай мэтай з'яўляецца імкненне да таго, каб выклікаць у дзяцей эмацыянальнае ўспрыманне яго мастацкага зместу.

З другога квартала выхавальнікі пачынаюць праводзіць спецыяльныя заняткі па завучванні вершаў. У адпаведнасці са здольнасцямі дзяцей дадзенай групы яшчэ не ставіцца задача запомніць на занятках увесь верш цалкам.

Само правядзенне заняткаў патрабуе ад педагога выкарыстання разнастайных метадаў і прыёмаў. Да іх можна аднесці: узорнае выразнае чытанне верша выхавальнікам, шматразовае яго паўтарэнне, якое будзе суправаджацца рознымі рухамі і дзеяннямі па вызначэнні якасцей і ўласцівасцей рэчы, наглядныя гульнявыя прыёмы. Паэтычныя творы, якія завучваліся на памяць з дзецьмі на занятках, можна паўтараць уранку, у штодзённых зносінах на працягу дня, у час гульняў, пры азнаямленні з навакольным светам, на занятках з іншых раздзелаў праграмы.

Метады і прыёмы правядзення заняткаў па азнаямленні дашкольнікаў з паэзіяй у сярэдняй групе значна пашыраюцца. З дзецьмі гэтага ўзросту ў пачатку заняткаў можна праводзіць уступную гутарку. Пры гэтым выхавальнік звяртаецца да дашкольнікаў з пытаннямі, якія звязаны са зместам твора, або прапануе ім прыгадаць адпаведныя падзеі. Тут жа можна паказаць карціну або рэч, пра якія дзеці будуць вучыць верш. Такая гутарка перад чытаннем верша дасць магчымасць звярнуцца да ўласнага вопыту дзіцяці, выклікае ў яго адпаведныя асацыяцыі. Так, пры завучванні верша Я.Коласа "Песня аб вясне" можна прыгадаць, якія змены адбыліся ў прыродзе. Што цікавага і новага дзеці падгледзелі ў вясны, калі ішлі ў дзіцячы сад? Можна выкарыстаць рэпрадукцыю з карціны І.Левітана "Сакавік", адзначыць, якія прыметы, адлюстраваныя на гэтай карціне, расказваюць пра надыход вясны. Папрасіць пералічыць іх, запытацца, чаму адбыліся такія змены ў прыродзе. Кароткая гутарка пра гаспадыню лесу вавёрку дапаможа дзецям глыбей зразумець сэнс верша "Вавёрка" Я.Журбы. У час гутаркі можна ўдакладніць у дзяцей, якіх увогуле лясных звяроў яны ведаюць. Хто з лясных жыхароў больш за іншыя прысмакі любіць арэхі? Прапанаваць апісаць гэтага звярка так, каб адразу ўсе здагадаліся. Пасля заканчэння гутаркі выхавальнік чытае верш дзецям. Як ужо адзначалася, акрамя ўступнай гутаркі перад чытаннем можна разглядаць з дашкольнікамі пэўную рэч ці цацку, жывую істоту ці расліну.Дзецям гэтага ўзросту; прапануючы верш для завучвання, неабходна даваць права выбару, улічваць іх інтарэсы.

Каб вершы не забываліся, іх неабходна чытаць часцей: на святах, вечарах адпачынку, кароткіх хвілінках паэзіі і г.д.

Для дзяцей старэйшай групы падбіраюцца вершы з больш складаным зместам і больш значныя па памеры. Каб дзеці глыбей маглі ўспрыняць верш і зразумець яго сэнс, выхавальнік праводзіць назіранні за з'явамі прыроды. Так, завучванне верша "Восень залатая" С.Новіка-Пеюна прадугледжвае назіранне дзяцей за гэтай парой года, вызначэнне яе колеру, пахаў, мовы.

Перш чым вучыць верш "Загадкі на градках" Р.Барадуліна, дзеці могуць разгледзець сапраўдную агародніну. З асаблівай увагай выхавальніку неабходна адносіцца да вершаў, багатых на паэтычныя выразы і незнаёмыя словы. Так, у вершы "Едзе восень" В.Рабкевіча расказваецца, як "едзе восень полем на рабым кані". Таму пасля чытання верша неабходна запытацца ў дзяцей, як яны разумеюць гэты выраз. Чаму восень едзе на "рабым кані"? Нагадаць ім змест народнай прыказкі: "Восень на рабым кані ездзіць: то снег, то слата" (такая чорная гразь). Дзеці, перапоўненыя ўражаннямі, зацікавяцца вершам, яго паэтычныя вобразы стануць блізкімі і зразумелымі ім. Глыбей успрыняць мастацкі змест вершаў можа дапамагчы музычны твор. Шмат музычных п'ес адлюстроўваюць прыроду: "Вясна", "Снежная завіруха" з балета "Пер-Гюнт" Э.Грыга, "Лясныя сцэны" Р.Шумана, "Поры года" П.Чайкоўскага і г.д. Перад тым як слухаць з дзецьмі музычны твор, выхавальнік павінен даць устаноўку на тое, што дзеці павінны ўбачыць у думках тыя карціны, якія малюе сваёй музыкай кампазітар. Ну, а потым ідзе чытанне паэтычнага твора.

У пачатку заняткаў, як і ў папярэдняй групе, праводзяць уступную гутарку, прапануюць дзецям прыгадаць падзеі з уласнага жыцця або разгледзець карціну, блізкую па змесце да верша. Так, завучванне верша Л.Геніюш "Год і яго род" можна пачаць з уступнай гутаркі аб порах года, аб тым, які ў іх колер, пах, мова. Выхавальнік удакладняе, ці можна параўнаць вясну з раніцай, лета з днём, восень з вечарам, зіму з ноччу і чаму; што карыснага прыносіць кожная пара года.

Пасля гэтага неабходна паведаміць, як называецца верш, хто яго напісаў. Потым выразна прачытаць яго на памяць. Пасля першага чытання ўдакладніць пэўныя словы і словазлучэнні. Пасля паўторнага чытання праводзяць гутарку па змесце верша. Выхавальнік папярэджвае, што верш дзеці будуць вучыць на памяць і таму трэба яго ўважліва слухаць. Ён чытае тэкст яшчэ раз, а потым выклікае дзяцей па чарзе для паўтарэння верша. Харавое завучванне вершаў у дзіцячым садзе не рэкамендуецца.

Дашкольнікі збольшага хутка запамінаюць верш, але не заўжды свядома засвойваюць яго змест. Калі паэтычны твор адносіцца да лірыкі, то характар праверкі яго ўспрымання будзе мець свае асаблівасці. Напрыклад, калі гэта пейзажная лірыка, то будзе правільным дапамагчы дзецям убачыць, адчуць і запомніць карціну, якую стварыў паэт, стан прыроды, які адлюстраваны ў вершаваных радках, адчуць мелодыю, музыку верша, яго настрой, а таксама вызначыць асабісты настрой пры чытанні верша. Пры гэтым вельмі важна звярнуць увагу малых на тую вобразную мову, якой напісаны верш, на яго рытм.

У гэтым выпадку можна параіць дзіцяці намаляваць тое, што яму ўяўлялася ў час чытання верша. Прыносіць карысць і "вуснае маляванне". Так, можна прапанаваць успомніць і вусна намаляваць свае ўяўленні тых карцінак прыроды, што апісаны ў вершы. У час гутаркі аб прачытаным можна выкарыстаць наступныя пытанні: "Што ўзнікае перад тваімі вачыма, калі ты чуеш гэтыя радкі?", "Што ты адчуваеш, чытаючы іх?", "Ці чуецца музыка, калі ты чытаеш гэтыя вершы?", "Якая музыка: сумная, вясёлая?", "Якія словы і словазлучэнні табе больш падабаюцца ў вершы?","Які гэта верш: вясёлы, сумны, бадзёры?", "Ці знаёмы табе такі стан прыроды, ці сустракаўся ты з ім у жыцці; калі так, то калі і пры якіх абставінах?", "Калі б ты захацеў прачытаць гэтыя вершы зноў, у якім выпадку і ў якой сітуацыі?".

Асобна неабходна спыніцца на ўспрыманні гумарыстычных вершаваных твораў. Выхавальнік павінен звярнуць увагу дзяцей на смешныя радкі ў тэксце, але не займацца іх падрабязным тлумачэннем. Смешнае, вясёлае прымаецца не логікай, не аналізам, а асаблівым пачуццём, пачуццём гумару. Калі педагог усё ж спрабуе растлумачыць такія творы, то смешнае перастае быць смешным. Для дашкольніка ўсе гумарыстычныя творы ў першую чаргу з'яўляюцца своеасаблівай "слоўнай" гульнёй, правілы якой вызначаны самім прызначэннем верша.

У старэйшай групе пры ўзнаўленні верша дзіця чытае яго змест ад пачатку да канца. Выхавальнік толькі падказвае асобныя словы або ставіць навадныя пытанні да тых слоў, што дзіця забывае. Напрыклад, пры завучванні верша Н.Гілевіча "Наша матулька" можна дапамагчы малым расказаць верш пры дапамозе наступных пытанняў: "Як клапацілася аб нас матулька?", "Чым паіла?", "Як клала спаць?", "Што вучыла казаць роднай мовай?".

Пераймаючы выхавальніка, дзеці вучацца чытаць вершы выразна, з адпаведнай інтанацыяй. Выхавальнік разам з тым можа растлумачыць дашкольнікам, як чытаць пэўныя выразныя месцы верша, дзе з замілаваннем, дзе з пяшчотай, дзе з пытальнай ці клічнай інтанацыяй.

Для таго каб усе дзеці запомнілі верш, можна яго паўтарыць у вольны ад заняткаў час.

Вялікія па памеры вершы ("Жук і слімак" М.Танка, "Акраец хлеба" І.Муравейкі і інш.) можна вывучаць на працягу двух заняткаў. На першым занятку выхавальнік падводзіць дзяцей да разумення тэксту. Чытае верш цалкам, потым паведамляе, што сёння яны будуць запамінаць толькі першую калонку верша. Паўторна чытае першую палову верша, якую дзеці запамінаюць на занятках. На наступных занятках чытаецца ўвесь верш. Выхавальнік выклікае аднаго-двух чалавек паўтарыць першую палову верша. Чытае другую палову верша, выклікае дзяцей яе паўтарыць. У канцы заняткаў 2—3 дзяцей паўтараюць увесь верш.

Як і ў сярэдняй групе, старэйшыя дашкольнікі чытаюць тэксты па ролях і інсцэніруюць іх. Да іх адносяцца вершы, якія напісаны ў дыялагічнай форме: "Пра ката і пра мышку" Е.Лось, "Ай! Не буду! Не хачу!" Р.Барадуліна, "Зайчаняткі" А.Бадака, "Алёшка і кошка" Э.Валасевіча.

Пасля завучвання верша выхавальнік размяркоўвае ролі сярод дзяцей і растлумачвае ім, калі і якую частку верша неабходна чытаць. Чытанне па ролях развівае ўвагу дзіцяці, прымушае яго сачыць за тэкстам.